**Назва музея:** Музей “Героі і подзвігі”

**Назва установы адукацыі:** Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 12 г.Оршы”

**Адрас музея:** Вітебская вобласць, г. Орша, вул. Канстанціна Заслонава, д.10, пакой 110.

**Профіль**: гістарычны (ваенна-гістарычны).

**Сайт музея**: няма

**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі**:

https://sh12.goroo-orsha.by/воспитательная-работа/идеологическая-работа/музей-герои-и-подвиги

**Старонка ў сацыяльных сетках:**

https://www.instagram.com/school_museum/

**Дата прысваення музею статусу “народны”**: не прысвойваўся

**Інфармацыя аб музеі:**

9 мая 1964г. педагагічны савет СШ № 12 прыняў рашэнне аб стварэнні музея на падставе дзейнасці атрадаў “чырвоных следапытаў” з мэтай стварэння музея – увекавечванне памяці герояў, вызваліцеляў Оршы і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першапачатковыя задачы музея: разыскаць франтавікоў, вызваляўшых Оршу, даведацца аб баявым шляху воінскіх злучэнній, знайсці месцы пахавання герояў, правесці паходы па месцах баёў. Сучасныя задачы музея: развіццё камунікатыўных кампетэнцый, навыукова-даследчай працы, творчых здольнасцей навучэнцаў; фарміраванне інтарэсу да айчынай культуры і гісторыі, паважальных адносін да каштоўнасцей мінулых пакаленняў; фарміраванне пачуцця адказнасці за захаванне гістарычнай памяці свойго народа, гонару за сваю Радзіму. Кіраўнік музея – Мяцельская Алена Вадзімаўна. Работа музея мае наступныя напрамкі: экскурсійна-лектарская работа; фондава-архіўная, пошукова-даследчая, арганізацыйна-масавая і выхаваўчая работа. У музеі праводзяцца аглядавая і тэматычныя экскурсіі: ”Чалавек мацней танкаў“, “Генацыд беларускага народа”, “Легендарны камбрыг – К.С.Заслонаў”, “Подзвіг афіцэра Ю.Бабкова”, “Баявы шлях 173-й Аршанскай стралковай дывізіі”, “Баявы шлях 192-й Аршанска-Хінганскай стралковай дывізіі”, “Музы не маўчалі”, інфармацыйныя і выхаваўчыя гадзіны, сустрэчы, кіналекторыі, урокі.

**Кароткая характарыстыка фондаў:** Асноўны – 156, які ўключае: архіўныя дакументы, фотаздымкі, наградныя дакументы, падзякі, газеты, пісьма перыяду 1941-1945гг., асабістыя рэчы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, фрагменты адзення, экіпіроўкі, знойдзенныя падчас паходаў па месцах баёў. Дапаможны фонд – 366, які ўключае копіі дакументаў, фотаздымкі, схемы.

**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы:** кісет перыяду Вялікай Айчыннай вайны, Барташа Н.М. – 1943/1970 , газета “Праўда” ад 09.05.1945г./2002, камсамольскі білет на імя Барташ Н.М. 1945г./1970, камсамольскі білет на імя Шкабарда П.А. 1939/1997гг.

**Апісанне экспазіцыі:**

1. “Генацыд беларускага народа”. У экспазіцыі прадстаўлены: калаж з фотаздымкаў перыяда Вялікай Айчынай вайны; інфармацыя даведачнага характару аб генацыдзе; тры карманы для сменнай інфармацыі аб лёсе людзей, звязаных з тэмай генацыда.

2. “Герой Савецкага Саюза”. У экспазіцыі маецца стэнд, прысвечаны біяграфіі і подзвігу К.С. Заслонава.

3. “Прынялі першы бой”. У экспазіцыі маюцца партрэты краснаармейцаў С.Дабычына і Я.Ісаева, лёс якіх вызначыўся падчас пошукавай дзейнасці музея і фотаздымкі следапытаў Савета музея падчас пошукавых паходаў.

У экспазіцыях №4-9 прадстаўлены кароткія характарыстыкі баявога шляху 16-й Карачаўскай стралковай дывізіі, 192-й Аршанска-Хінганскай стралковай дывізіі, 173-й Аршанская стралковай дывізіі, 35-га танкавага палка прарыву, 125-га жаночага авіяпалка імя М. Расковай, 4-га штурмавога авіяпалка, 621-й бамбардзіровачнай авіядывізіі, 5-й бамбардзіровачнай авіядывізіі, шэраг партрэтаў з біяграфіяй і апісаннем подзвігу герояў пералічаных вышэй воінскіх частак.

10. “Яны вызвалялі наш горад”. У экспазіцыі прадстаўлена інфармацыя з апавяданнем аб подзвігах герояў – Галаскокава У.А., Чугаева Е.Я., Петерса А.П. і інш., якія былі сябрамі музея, але іх воінскія часткі не прадстаўлены ў музее. Цэнтральнае месца экспазіцыі займае дыярама аб подзвіге Героя Савецкага Саюза Галаскокава У.А., атрымаўшага званне Героя Савецкага Саюза пры вызваленні Оршы летам 1944г.

**Узнагароды:**

**Кіраўніка музея -** Мяцельская Алена Вадзімаўна

2019г. – Званне Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Міністэраства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

2022г. – Падзяка Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Міжнародны фестываль дзіцячага патрыятычнага кіно “Родам з Цверы”, 2022год, Дыплом I ступені (вучаніца 9 кл. Шрамава Паліна) ад Грамадскай палаты г.Цверы.

**Фотаздымкі музея:**
https://cloud.mail.ru/public/A5bL/L2wEdbJdQ

**Дадатковая матэрыялы:**

Ролік аб музеі:
https://youtu.be/ODMYN-3hyEA